9 сентября, четверг 1999 г.
N36 (81)
Приложение - программа ТВ
Цена - 25000 руб.

Биржа информации

У "ПАГОНІ" АДКЛЮЧАЛІ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

Раніцай электрык ЖЭСа прыйшлоў у рэдакцыю гродзенскай газеты "Пагоня", адключыў святло і апячатаў лічыльнік. Кампутары і электронная пошта не дзейнічалі цэлы дзень, праца журналістаў была паралізавана.

У ЖРЭУ чамусьці вырашылі, што рэдакцыя задаўжала за арэнду памяшкання. Рэдактару-М.Маркевічу нават сказалі, што ў 37-ым годзе за такія справы маглі б увогуле расстраляць, а тут усяго толькі выключылі святло. Некалькі гадзін спатрэбілася рэдактару, каб камунальнікі разабраліся, што з арэнднай платай усё о'кей. У 17 гадзін зноў з'явіўся электрык і даў электраток.

Перад тым вакол "Пагоні" адбыўся яшчэ адзін скандал. Адзін "пільны" інспектар райана ўбачыў у гродзенскай школе падыўку газеты і ўзняў вэрхал на ўвесь горад. Арганізавацы бясплатную падпіску для школ і бібліятэк рэдакцыі дапамог БАЖ. Аднак, як высвятляецца, у бібліятэках і школах маюць права на існаванне толькі дзяржаўныя газеты.

С.МАКСІМОВІЧ

Деньги могут вернуть

8 сентября состоялось заседание Конституционного суда, на котором рассмотрено дело о соответствии Конституции и другим актам законодательства республики разъяснений Главной государственной налоговой инспекции при Кабинете Министров Беларуси от 16 июня 1995 г. "О возвращении излишне взысканных платежей в бюджет". Дело должно было рассматриваться по предложению Высшего хозяйственного суда, внесенному в Конституционный суд 19 июля 1999 года.

БелаПАН

100 телефонных звонков гродненцам

РЫНКИ БАСТУЮТ. НАРОД ПОНИМАЕТ

Уже неделю бастуют гродненские предприниматели. Они требуют отмены президентского декрета №14. Согласно декрету, у предпринимателей могут конфисковать товар, если они неправильно оформят документы или не покажут справку о покупке валюты. Предполагается, что товар могут конфисковать на основании спорных положений декрета. Ясно, что если уж вопрос о конфискации будет спорным, то у нас он решится никак не в пользу предпринимателя. Кроме того, от рыночников требуют сертификации товара в Беларуси. Хотя каждый предприниматель, который везет товар из-за границы, уже имеет на него сертификат. Его выдает продавец или производитель - в магазине или на предприятии. Процедура оформления сертификата у нас затягивается на две-три недели. В результате - товар простаивает. Предприниматели хотят или полной отмены сертификатов, или хотя бы упрощения самой процедуры их получения. Еще одно требование, которое предъявляют рыночникам - предоставление справки о покупке валюты, вообще невыполнимо. Все знают, что валюту в белорусских банках не продают, а предприниматели покупают доллары на черном рынке. Откуда же взять справку?

Сейчас бастуют около 70% рынков в Беларуси. Более 20-ти профсоюзов решили объединиться в республиканский профсоюз предпринимателей. Координировать его будет Валерий Левоневский. Предприниматели говорят, что они готовы бастовать даже два месяца. А нам все это время придется отовариваться в магазинах, где тот же шампунь стоит чуть ли не в полтора раза дороже. Кстати, чиновники в кулуарах говорят, что именно это им и выгодно: мол, теперь товары в магазинах будут раскупаться. Но ведь рыночники платили налоги, и не маленькие. И, наверное, государству крайне невыгодно иметь целый полк безработных: кроме предпринимателей на рынке работали водители маршрутных автобусов, которые возили людей на рынок.

Поэтому, уважаемые гродненцы, мы решили задать вам вопрос:



ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ПОЧЕМУ БАСТУЮТ ПРЕДПРИНИМАТЕЛИ НА РЫНКАХ

НЕТ - 50%

Ровно половина опрошенных не знает, чего же требуют от властей предприниматели. Среди них оказались работники государственных предприятий, люди старшего поколения и поклонники белорусских товаров. ***"Мы оба пенсионеры и не вникаем в дела предпринимателей"***, - ответил один из респондентов. ***"Вы знаете, я работаю на государственном предприятии. На рынке бываю редко. Обычно все покупаю в магазине. Минский трикотаж - лучше не придумаешь"***. Или: ***"Наши товары - куда лучше. Купила я однажды шпроты польские на рынке - ужас!"*** Среди представителей группы оказались даже такие граждане, которые вообще не слышали о забастовке.

ДА - тоже 50%

Вторая половина гродненцев все-таки имеет представление, хотя и очень смутное, о причине протеста гродненских рыночников. ***"Вроде бы, налоги слишком большие"***. ***"По поводу документов, которых слишком много от них требуют"***. Среди гродненцев, участвовавших в опросе, оказалось трое предпринимателей. Естественно, они тоже попали в эту группу. Женщина, которая работает на рынке, считает, что тут виноваты местные власти. Второй предприниматель сформулировал свои требования так: ***"Мы хотим отмены документов, требования которых невозможно выполнить"***.

Для того, чтобы составить представление о том, какая же часть гродненцев поддерживает предпринимателей, а какая - нет, мы решили объяснить группе неосведомленных гродненцев, чего же хотят добиться работники рынков. После этого голоса распределились следующим образом:

ПОДДЕРЖИВАЮ - 77%

Абсолютное большинство гродненцев поддерживает предпринимателей. Две трети респондентов этой группы оказались откровенными доброжелателями. Они считают, что ***"это несправедливо. Люди хотят на жизнь зарабатывать, а условий нет никаких"***. ***"Работы другой у них нет. Многие еле перебиваются"***. А ***"если большие налоги, то прибыли у них совсем мало"***. В меньшинстве оказались эгоисты, которые знают, что ***"если налоги выше - значит и цена выше, а нам это невыгодно"***. Раз уж рынки не работают, придется идти в магазин, а там ***"вывалишь кучу денег, тогда как на рынке можно вывалить половину этой кучи"***. Один из собеседников сказал, что у него работают на рынке знакомые, у которых он всегда отоваривается. А они взамен снижают цену на несколько долларов.

НЕТ - 9%

Эта группа целиком состоит из пенсионеров.

Один из опрошенных сказал, что он не поддерживает рыночников, потому что пришел с зарплатой на рынок, а тут - забастовка. Еще один гродненец заявил, что ***"теперь им все законно придется делать. Они возили левый товар и налоги не платили"***. Интересно, как рыночники могут выполнять законы, если учесть, что, во-первых, предприниматели никак не могут повлиять на принятие цивилизованных законов, а во-вторых, законы у нас давно называются "декретами", и имеют свойство видоизменяться со скоростью, обратно пропорциональной логике.

НЕ ЗНАЮ - 14%

Из них половине абсолютно безразлично, почему бастуют предприниматели. ***"Не знаю и знать не хочу. У них свои проблемы, у меня - свои"***. Вторая половина не может решиться: поддержать предпринимателей или все-таки нет. ***"С одной стороны, они правы, с другой - государство"***. Неопределившихся оказалось совсем немного, и это радует. Подавляющее большинство жителей нашего города имеет свое мнение по этому вопросу. Хотя попадались и такие, кто, услышав о президентском декрете, боялись прямо ответить на вопрос: ***"Я человек нейтральный и в бизнесе не разбираюсь. Спросите, пожалуйста, кого-нибудь другого"***.

ОИС

БЕЗ ГОЛОДОВКИ - ГОЛОДНО

Вадим ЖУРАВЛЕВ



Когда пролетариату нечего терять, кроме своих цепей, он берется за булыжник. Такое было. Но сегодня - то ли культура не позволяет швыряться камнями, то ли терпение еще не лопнуло - рабочие осваивают иные формы протеста. В СП ООО "Альформа" дошли даже до угрозы забастовкой. В ночь с 31 августа на 1 сентября председатель Свободного профсоюза Ирина Байрашевская и ее заместитель Светлана Зенько были полны решимости начать голодовку под мозаичным панно, где центральную группу рабочих возглавляет женщина, прижимающая к груди своего ребенка. И только благодаря усилиям зам. мэра г.Гродно Валентины Лавцель и зам. руководителя администрации Ленинского района Александра Сивцова, включившихся в ночной диалог с "протестантками", голодовку профсоюзных лидеров удалось предотвратить; и утром того же дня разговор продолжился в мэрии. Об этом происшествии "Биржа информации" уже сообщала.

"ДЯДЕЧКА, ДАЙ ДЕНЕЖКУ..."

На днях, поднимаясь по лестничной клетке, я наткнулся на сцену, которую сам не придумаешь. Женщина нажимает на кнопки звонков и быстро уходит вверх. Под кнопкой остается девчушка. И когда открывается дверь, она жалобно лопочет: "Дядечка, дай денежку... Дядечка, покорми..." Один дядечка дал денежку, другой - нет, а третья дверь и вовсе не открылась. Тогда девочка пошла вслед за матерью. И вновь - звонок: "Тетечка, дай денежку... Тетечка, накорми..."

Из рук СП ООО "Альформа" худо-бедно кормятся сотни гродненцев. Это совместное предприятие; в прессе его называли белорусско-голландским, но это не так. Десятки рабочих, профсоюзные лидеры, с которыми я беседовал в последние дни, сами убеждены в полуголландском происхождении креветочного производства. И лишь в офисе "Альформа" мне стало известно, что учредителями СП на сегодняшний день являются гродненская фирма "Альфа-100" и американская "Форматранс". Это подтвердили и в горисполкоме. Из властного источника стало известно, что американский учредитель внес положенные 20 тысяч долларов в уставный фонд предприятия, чего не скажешь о белорусском партнере (его доля - 10 тысяч долларов).

В офисе СП мне дали понять, что "Альфа-100" скорее субъект формально-юридический, и он нечто имеет от отходов креветочного производства. СП долгое время работало с голландской фирмой "Goldfish", поставлявшей в Гродно креветки; она же являлась собственником сырья и готового продукта. Затем "Золотая рыбка" вошла в крупнейшую европейскую фирму "Хайплуг" (Голландия). Она владелец и тех креветок, которые обрабатываются на предприятиях Марокко, Румынии, Болгарии и других стран. Качество продукта, отгружаемого в Гродно, считается высоким. Он потребляется в особых ресторанах, клиенты которых при выборе блюд с деньгами не считаются.

Окончание на стр 3.

Неуловимая валюта таможни

Даже самая твердая валюта имеет свойство испаряться. Это доказано и ревизионной проверкой банковских и кассовых операций, которые осуществлялись Гродненской региональной таможней. И тогда была выявлена недостача более 14 тысяч долларов США и 888 миллионов рублей.

Летом региональная таможня оказалась в поле зрения комиссии Государственного таможенного комитета Беларуси. По результатам проверки начальник таможни Николай Кривец и главный бухгалтер Наталья Барцевич были огорчены наложенными на них взысканиями. А вот О.Жук и А.Гирба, непосредственно обслуживавшие денежные ценности, в августе по приказу Кривца были уволены с работы. Как утратившие доверие нанимателя.

И вот, в середине сентября в столице в течение двух дней ожидается внеочередная аттестация гродненского номенклатурного ядра - от начальника таможенного поста до начальника региональной таможни. И невольно возникает вопрос: "Кто Кем Оттуда вернется?".

В.АЙДАРОВ

П А Д З Е Я

Удзячныя нашчадкі



Найвышэйшы гетман ВКЛ Канстанцін Астрожскі

8 верасня побач з Каложскай царквой гродзенская грамадскасць адзначыла 485-ыя ўгодкі Аршанскай бітвы. Як і ў мінулым годзе, правядзенне мерапрыемства было дазволена мясцовымі ўладамі. Арганізатарам свята выступіла гродзенская арганізацыя Беларускага народнага фронту "Адраджэньне". У праграме: рыцарскі турнір і канцэрт вядомых беларускіх бардаў.

Як сцвярджаюць гісторыкі, Аршанская бітва - адна з буйнейшых бітваў на тэрыторыі Еўропы ў пачатку ХУІ стагоддзя. 30-тысячнае беларуска-літоўскае войска на чале з гетманам Канстанцінам Астрожскім разграміла 80-тысячнае войска Маскоўскіх ваяводаў. У вайсковай гісторыі нашай дзяржавы гэта была адна з самых бліскучых перамог. У выніку гэтай бітвы ўсходняя Беларусь была вызвалена ад расійскіх войскаў. У той час гэта азначала вельмі шмат для нашага народа і нашай дзяржавы. Адзіная бяда гэтай перамогі - пра яе ніяк нельга ўзгадваць у сучаснай афіцыйнай абстаноўцы. Больш таго, прыдворныя гісторыкі могуць перавярнуць яе з ног на галаву, абы толькі там не прагучала, што беларусы разбілі рускае войска. Сучасная прапаганда навязвае толькі адну думку - мы стагоддзямі жылі разам і таму трэба інтэгравацца. Аднак аб'ектыўная гісторыя паказвае, што мы папросту жылі побач, але не заўсёды мірна. Нашыя продкі ніколі не хацелі скарацца перад сваімі ўсходнімі суседзямі і заўсёды здолелі адстаяць сваю Радзіму. Праўда, да пэўнага часу, пакуль іх тыя ж суседзі з сваімі моцнымі сябрамі ўсё ж не разарвалі на часткі.

І гэта толькі гісторыя, якую змяніць ужо немагчыма. Канечне, яе спрабуюць фальсіфікаваць, трактуюць згодна адпаведнай ідэалогіі, але змяніць яе немагчыма. А вось правільныя высновы зрабіць давядзецца абавязкова. Так як немцам. Яны не маюць звычкі адмаўляць ці фальсіфікаваць тое, што ў Другой Сусветнай вайне іх перамагла Савецкая армія. І толькі дзякуючы праўдзе і пакаянню яны здолелі пабудаваць сапраўдную сучасную цывілізаваную краіну.

Нам пара ўрэшце даведацца аб саміх сабе больш падрабязна, каб зразумець, што з намі адбываецца і выправіць становішча, паколькі клаў жа нехта свае галовы на палях бітваў дзеля таго, каб мы нарадзіліся. Пра гэта нельга забываць, як робяць гэта тыя ўдзячныя нашчадкі, што збіраюцца побач з Каложай, каб ушанаваць памяць сваіх продкаў.

М.МІКАЛАЙЧЫК

Г Р О Д Н А

І ў нас святкавалі

У абласной бібліятэцы імя Я.Карскага праходзіла традыцыйнае свята беларускага пісьменства і друку. Ізноў былі выставы-прагляды, сустрэчы, гутаркі, дыскусіі, знаёмствы з новымі і старымі беларускімі выданнямі ў якіх распавядаецца пра гістарычны і сучасны шлях беларускай кнігі і пісьменства. У чацвер адбудзецца ўрачыстае закрыццё тыдня вечарынай "Край мой - горад мой". Пачатак у 15.00. Шчыра запрашаем чытачоў у нашу бібліятэку на сустрэчу з лепшымі выданнямі беларускіх пісьменнікаў, чароўным светам друкаванага слова.

Станіслаў МІХАЛЬЧЫК,
галоўны бібліятэкар ГАНБ імя Я.Карскага

Выратаваныя каштоўнасці

У Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі ёсць экспазіцыя пад назвай "Скарбы, вернутыя народу". Тут знаходзяцца самыя цікавыя прадметы, канфіскаваныя апошнім часам супрацоўнікамі УКДБ разам з мытнікамі ў кантрабандыстаў на граніцы.

Прыемна, што нарэшце перамагла справядлівасць, і адабраная кантрабанда больш не адпраўляецца ў Маскву, а застаецца ў нас. Сярод новых экспанатаў - чатыры рускія іконы другой паловы XIX ст., некалькі выдадзеных да рэвалюцыі ў Маскве і Санкт-Пецярбургу рэдкіх кніг, у тым ліку - іўдзейскі малітоўнік на нямецкай мове, альбомы з рэдкімі калекцыямі, заходнееўрапейскі і расійскі фарфор і інш.

З другіх рэчаў найбольшую каштоўнасць уяўляе 2-кілаграмовае сувенірнае блюда з серабра з уманціраванымі дзевяццю медалямі і кляймом Фабержэ.

Ю.ШАСТАК

А С Т Р А В Е Ц

Спірт, цыгарэты і кампутары

Быццам пчолы мёд, аблюбавалі злодзеі склады Ашмянскай мытні, якія знаходзяцца на аптовагандлёвай базе спажывецкага райтаварыства. Напачатку адтуль былі скрадзены аўтамабілі са спіртам, затым цыгарэты. Гэтыя гучныя справы і дагэтуль застаюцца нераскрытымі. І вось нядаўна новы падарунак: са складоў бясследна зніклі восем кампутараў, якія ацэнены больш чым у 4 мільярды рублёў. Праваахоўныя органы, вядома, шукаюць злачынцаў.

Японцы зноў на Астравеччыне

Умінулую суботу Астравеччыну наведаў часовы паверан у справах Японіі ў Беларусі спадар Паннацуі з жонкай. Ягонай мэтай было наведаць радзіму і магілу вядомага беларуса - даследчыка Японіі і першага консула царскай Расіі ў гэтай краіне - Іосіфа Гашкевіча. Падчас наведвання вёскі Малі, дзе нарадзіўся наш славуты зямляк, японскаму госцю паказалі экспазіцыю прысвечаную І.Гашкевічу. Было заўважна, што госць вельмі хваляваўся.

Нагадаем, што ў нашай краіне дагэтуль мала вядома імя Іосіфа Гашкевіча. Больш таго, у 80-ыя гады ягоную магілу, дзякуючы дэмакратычным працэсам у СССР, адшукалі менавіта японскія дыпламаты. Наш зямляк, як пазней аказалася, лічыўся чуць ці не героям японскага народу. І гэты народ аб ім ніколі не забываў, чакаючы магчымасці пабываць на яго магіле. Нам, напэўна, калі-небудзь яшчэ давядзецца пазнаёміцца з жыццём гэтага цудоўнага чалавека.

М.ВЯНГРОЎСКІ

В А Ў К А В Ы С К

Новае можа быць зусім новым

Спецыялістамі Ваўкавыскага завода ліцейнага абсталявання распрацаваны і выраблены ўзоры новай тэхнікі. Сярод іх зернедрабілка да трактара МТЗ, прадуктыўнасць якой складае 0.8 тоны ў гадзіну. Ужо вялікую зацікаўленасць выказалі заказчыкі да новага агрэгата для мыцця аўтамабіляў. А вось прыстасаванне для рэзкі тратуарнай пліткі, распрацаванае ваўкавыскімі спецыялістамі, можа скласці сур'ёзную канкурэнцыю існуючаму абсталяванню. Справа ў тым, што навінка зроблена цалкам па іншай тэхналогіі і можа разрэзваць будаўнічыя матэрыялы таўшчынёю да 100 мм. і даўжынёю больш 400 мм.

Спяшайцеся набыць ваўкавыскія навінкі!

З свету па нітцы

Прадпрыемствы і гаспадаркі Ваўкавыскага раёна ўсімі магчымі сродкамі стараюцца дапамагчы будаўніцтву ў раённым цэнтры корпуса новага хірургічнага аддзялення. Так 600 млн. рублёў на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі выдзеліла прадпрыемства "Краснасельскцэмент", 70 млн. саўгас "Ваўкавыскі" і г.д. Мільярд сабралі, але яшчэ неабходна 2.5 млрд. рублёў.

М.ГАШЫМАЎ

М И Н С К

Выйти из кризиса

В Минске создан оргкомитет по подготовке учредительного съезда общественного движения "За демократические и свободные выборы", проведение которого намечено ориентировочно на начало декабря.

Оргкомитет возглавил экс-спикер Верховного Совета Беларуси 12-го созыва Мечеслав Гриб. В его структуре созданы четыре комиссии: организационная; по разработке уставных и программных документов; по связям с общественными и международными организациями; информационная.

Члены оргкомитета приняли обращение к гражданам и общественным объединениям страны. В нем подчеркивается, что демократические выборы парламента и президента являются "основным средством решения конституционного кризиса в Беларуси". В новое движение смогут войти представители общественных объединений, члены избирательных комиссий, чиновники и предприниматели, руководители предприятий и хозяйств, а также рядовые избиратели. "Мы не преследуем цели прихода к власти, не претендуем на ведущую роль в политическом процессе и не собираемся подменять политические партии в борьбе за власть, -- подчеркивается в обращении. -- Основная задача движения -- обеспечить возможность проведения открытых и честных выборов и референдумов в Беларуси, помочь их организовать и провести без нарушения избирательного законодательства, обеспечив тем самым в Беларуси возможность избрания легитимной власти".

Наталья КУЛАГИНА, БелаПАН

А Ш М Я Н Ы

Цэны на бензін кусаюцца

Днямі ў Ашмянах адкрылася новая АЗС. Яе ўладальнік - фірма "Аграсакрат". Праўда, мясцовых аўтааматараў гэта не вельмі пара- давала. Запраўляюцца тут у асноўным аўтамабілі з літоўскімі нумарамі, паколькі кошты на бензін для беларусаў практычна недаступныя. Да ўсяго, мясцовы райвыканкам прыняў рашэнне запраўляць аўтамабілі толькі па 20 літраў.

М.ВЯНГРОЎСКІ

Случаи Происшествия Преступления

Водитель справился сам

Днем, недалеко от Гродно гражданин Ю. остановил проезжавшую мимо машину и попросился доехать до деревни Поречье. По дороге ему в голову пришла "мысль": он достал нож и начал угрожать им водителю, требуя денег. Однако водитель не растерялся, оказал достойное сопротивление и привез преступника прямиком в районное отделение милиции.

Вот и подвози после этого одинокого уставшего путника.

Продлил себе срок

Приблизительно около девяти часов вечера практически в центре Гродно к гуляющему молодому человеку подскочил мужчина и, вырвав у него из рук сумочку, быстренько скрылся. В сумочке был калькулятор и 20 долларов. Позже участковым этого района преступник был задержан. Оказывается, он уже отбывает наказание в спецкомендатуре при Октябрьском РОВД.

Не повезло медику

Из квартиры медсестры одной из женских городских консультаций неизвестные украли 18 миллионов рублей, 18 долларов, золотые перстни и цепочки с кулоном, более 30 золотых зубных коронок, мельхиоровые серьги и два обручальные кольца. Преступников ищут.

Вымогатели

Трое ранее судимых жителей Гродно были задержаны сотрудниками милиции при попытке вымогательства тысячи долларов у одного из жителей нашего города. Все вымогатели 1971 года рождения. События происходили рядом с магазином "Самара" на проспекте Я.Купалы. Ведется следствие.

МНК

С Л О Н І М

Працягваюць "мініраваць"

Апоўдні 3 верасня адзін з рабочых Слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыкі ўбачыў у кустах на абочыне Брэсцкай вуліцы падазроную металічную каністру, да якой ізаляцыйнай лентай былі прымацаваны каляровыя правады. Пра знаходку паведамілі ў міліцыю.

Праз хвілін 15-20 участак Брэсцкай вуліцы, што насупраць станцыі тэхабслугоўвання аўтамабіляў, ачапіла міліцыя. А ўвесь транспарт быў накіраваны ў аб'езд.

На месца здарэння прыбылі машыны пажарнай і медыцынскай службаў. Работнікі КПФ і прахожыя былі адведзены на небяспечную адлегласць. На месцы здарэння побач з падазронай знаходкай засталіся стаяць толькі двое бясстрашных мужчын: старшыня Слонімскага гарвыканкама Алег Лакцюшын і начальнік міліцыі Мечыслаў Батура.

Праз дзве з паловай гадзіны прыбылі сапёры з Гродна, якія ўважліва агледзелі каністру і не знайшлі ніякага выбуховага прыстасавання. Нагадаем, што "мініраванні" у Слоніме працягваюцца ўжо каля года. Да гэтага выбуховыя прыстасаванні гродзенскія сапёры неаднаразова шукалі на слонімскім вакзале, у гарадской бібліятэцы, адной са школ, а нядаўна і ў мясцовым "белым доме".


"ГС"

О Т М А К Е Т А - К Д В О Р Ц У

Польская школа в Волковыске

Теперь это не воздушный замок, а бело-желто-вишневого цвета здание в Волковыске, - польская школа на 198 учащихся. Автор проекта - Александр Быстров. Данная работа принесла ему звание лауреата областного смотра на лучший проект года. Главный инженер проекта - Мария Якимович.

Сложный рельеф с большими перепадами высот подтолкнул Быстрова к оригинальным проектным решениям. Школа двухэтажная , однако благодаря трем террасам она кажется гораздо выше. В плане она шестиугольная. Все помещения формируются вокруг многофункционального пространства - общешкольного форума. Это - и большая рекреация для отдыха в перерывах между занятиями, и информационное поле, и место для театральных представлений и т.д. под большим зенитным фонарем. Внутренние коридоры также освещены фонарями. А центральная лестница связывает входную группу школы с учебными этажами и форумом.



От некоторых первоначальных замыслов пришлось отказаться. Это обусловлено финансовыми возможностями заказчика. И поэтому, в частности, в школе не оказалось обсерватории.

А. ИЛЬИН

На снимке: макет польской школы в Волковыске.

БЕЗ ГОЛОДОВКИ – ГОЛОДНО

Окончание, начало на стр. 1


Можно заказать креветки и в гродненских ресторанах: в "Блюзе" одна порция стоит три миллиона рублей, в "Золотом теленке" - дешевле; их происхождением я не интересовался, только "Альформа" к этим поставкам официально непричастна, поскольку "ее" продукт уходит за границу - по 20 - 25 тонн в месяц. Это предприятие - не владелец, а переработчик давальческого сырья. Его работники могут лишь тайком поесть креветки - это их "привилегия", но заработная плата самих "креветок" такова, что им и третьесортная говядина малодоступна. Собственно, и "бабий бунт" - сначала в июле, а потом и в августе - свидетельство нищенского прозябания представителей наемного труда. В августе они с горем пополам дотянули до получки, но когда задержка с ее выдачей превысила 10 дней, гроздья женского гнева прорвались наружу, и тогда красивое и нежное, чем восхищаются мужчины, приобрело иные черты... Очевидцы "некрасивых" сцен это подтверждают. И если при выдаче денег возникает потребность в милиционере, то одно это говорит о многом... А между тем наш человек стожилен. Значит, допекло. Значит, действительно детей нечем кормить - хоть иди и на "кнопку" нажимай.

ОТВРАТИТЕЛЬНАЯ МЕРА

И женщины нажали. Да так - и здесь не обошлось без прессы, - что забегали в столице. В офисе "Альформа" сказали, что сам премьер-министр Линг дал некое указание своим чиновникам. Во всяком случае дирекция СП была вынуждена отправить факс в Министерство иностранных дел, в данном случае выступающее как регистрирующий орган.

А в Гродненском горисполкоме оперативно созвали совет по трудовым и социальным спорам. И там пришли к выводу: отношение к трудовому коллективу со стороны администрации СП ООО "Альформа" издевательское, а перед собственником поставлен вопрос об освобождении от занимаемой должности директора СП и его заместителя.

Сколько в СП народу? Это калейдоскоп кадров с часто мелькающими лицами. Например, за июль здесь получали заработную плату 687 человек. И только в августе, по данным начальника отдела кадров Л. Овчинниковой, с работы уволены 130 человек и 42 приняты на работу. Июльские увольнения составили 110 "номеров", а в новые договорные отношения с нанимателем вступили 138 горожан. Кто заявил о готовности работать четыре часа в смену, кто - 6. И где-то 380 "номеров" обязаны трудиться по 8 часов в смену (цифра сентябрьская). Предприятие познало приливы и отливы: выдачу бананов и песни женщин, гневные реплики и грохот посуды, ударяемой по металлическим столам, за которыми трудятся обработчицы креветок. Говорят, что в ноябре-декабре прошлого года женщины могли приходить и к четырем часам утра, чтобы занять очередь на получение рабочего места. А нынешним летом не выдавали трудовые книжки, чтобы сдержать бегство рабочих с предприятия. Что произошло?



Весной администрация предприятия несколько раз, и весьма солидно, изменила расценки в пользу рабочих, но вскоре резко сбросила их. Это и усугубило ситуацию. В июне, по словам директора предприятия Александра Савостьянова, средняя заработная плата подскочила до 21 миллиона рублей (рабочие крепко сомневаются, хотя встречались и согласные с этой цифрой), а в июле упала до 15 миллионов; августовская зарплата ожидается в пределах 13 миллионов рублей. При этом надо иметь в виду, что средняя цифра, даже если она и не фальшива, то явно лукавит: многие женщины работают по 10 - 12 часов, а кто-то выдерживает и две смены кряду. Многие выходят на работу и в выходные дни - это вошло в систему.

Трудно разговаривать с очень обиженными женщинами, но мне хотелось кое в чем разобраться, и я задавал и не очень приятные вопросы. У кого-то даже сложилось впечатление, что журналист подкуплен директором. А ведь я мог, к примеру, только и сказать, что их директор получает всего-навсего 30 миллионов рублей, а президент Беларуси - самый бедный президент в мире. И вовсе не воспринималась информация о крупных потерях предприятия при продаже валюты по официальному курсу Нацбанка.

- Мы хотели улучшить репутацию "креветок", - говорит директор предприятия Александр Савостьянов. - Но слишком резко повысили расценки. Переговоры с партнером велись несколько месяцев. В июле резервы были исчерпаны, и мы отказались от новых расценок, к которым люди успели привыкнуть... Мера эта отвратительная и, надеюсь, временная. А пока наше предприятие нерентабельное. У нас 20 миллиардов рублей убытка... Я готов работать с профсоюзом и подписать трудовое соглашение. Только надо работать с администрацией, а не душить...

Савостьянову 22 года. Он стал директором СП "Альформа" год назад. Это студент-юрист стационара пятого курса Гродненского госуниверситета им. Я. Купалы. Я не счел нужным спрашивать, как это ему удалось возвыситься до директорского кресла белорусско-американского предприятия, а вот некоторые девчата слишком категоричны: Савостьянов, мол, фигура подставная; их деньги уходят в другие фирмы и т.д. Но при этом никаких фактов, одни только эмоции...

КУКИШ ИЗ ТРЕХ КУПЮР

У Свободного профсоюза "креветок", насчитывающего более 200 членов, минимальный опыт работы с директором. Его лидеры только недавно узнали, где находится офис - их разделяет менее километра, помещение арендуется у прядильно-ниточного объединения. Профсоюз создавался в июле на волне стихийного протеста рабочих. Его оформлению содействовал член республиканского совета Свободного профсоюза Валерий Левоневский. Кое-кто упрекает его в амбициозности, в стремлении заработать политические очки на трудовых конфликтах и в прочих "грехах". Но ведь не официальные же профсоюзы посочувствовали и откликнулись на боль "креветок", и не их лидеры пришли поддержать Байрашевскую и Зенько, но опять-таки Левоневский со товарищи: член ревизионной комиссии Свободного профсоюза белорусского Владимир Совца, председатель контрольно-ревизионной комиссии Свободного профсоюза работников Гродненского производственного тонкосуконного объединения Владык Скорб, председатель Гродненского регионального отделения Белорусского Хельсинкского Комитета по защите прав человека Александр Антонюк. Эта моральная поддержка женщин накануне голодовки тем более ценна, что обработчицы креветок после второй смены разошлись по домам - все до единой... Кстати, креветки - это подотряд беспозвоночных животных отряда десятиногих ракообразных (декапод). А вот наши профсоюзы все еще беспозвоночные существа, настолько они робки и марионеточны в момент отстаивания законных интересов наемного труда. И это хорошо, что у Свободного профсоюза работников СП ООО "Альформа" наконец-то стали появляться первые позвонки...

Этот факт следует осмыслить. Бунт личности - это одно, а методическая работа в трудовом коллективе - это другое и более существенное. Да, это женский коллектив, здесь много и матерей-одиночек. Им надо спешить к детям, им не до борьбы за общие высокие цели. И нет резона их упрекать, если мужики - беззубые, если политические партии возятся в своем узком кругу, а рабочий человек и знает только, что где-то есть какие-то коммунисты и БНФ, а названия других партий даже в памяти не зафиксировались. Политики говорят о демократии, о президенте-деспоте, а вот о "демосе" - о народе забывают, не идут в народ. А нашему "демосу" покажи грош - он и проголосует за усатого "дядечку", который вовремя сунет "денежку" в руку, потянувшуюся за избирательным бюллетенем.

За двумя женщинами, решившими "голодовать" (это их выражение), надо видеть обнищавшую массу белорусов. Вот приходит к "креветкам" учительница, чтобы отдать четыре часа труду примитивному и отупляющему, вредному (за два дня я насмотрелся женских рук с разъеденной кожей). Ради 4 миллионов рублей, которые она заработает в СП в течение месяца. В школе ей доверили детские души, а здесь она ломает, как спички, трупы креветок, потому что наш учитель - бедняк. И приходит подрабатывать женщина-инженер. А вслед за ней и оператор ЭВМ или слесарь КИПиА, или особа, владеющая двумя иностранными языками. А за стеной работает мастер - мужчина, который изо дня в день ремонтирует телевизоры, радиоприемники, магнитофоны 20 наименований; в июле ему начислили 15 миллионов рублей. Три купюры по 5 миллионов каждая - очередная фигура из трех пальцев великого интегратора. И "демос" слушает его байки. И ему не часто напоминают, что Европа после второй мировой войны восстала из пепла быстрее, чем затрачено времени на причитания о развале СССР. А между тем уже не одиночки, а весь народ подходит к той "кнопке", под которой клянчат: "Дядечка, дай денежку... Дядечка, покорми..." А достойней не клянчить, а взломать дверь, за которой прячется тот, которого едва ли не вся Европа не признает...

СРАВНИМ

Питание и труд в тюрьме

В Гродно много людей, которые зарабатывают в пределах 12 миллионов рублей в месяц. У других доход и того меньше. А средняя заработная плата на промышленных предприятиях города составила в июле 24 миллиона рублей. В семьях - дети, старики, студенты и т.д.

Предположим, что на одного человека семья затрачивает 12 миллионов рублей в месяц. Что она может себе позволить? Для этого прибегнем к сравнению, которое может показаться некорректным, но оно весьма красноречиво и символично. Люди, не лишенные воображения и здравого смысла, сами оценят качество жизни белоруса. А точкой отсчета пусть послужат затраты на содержание в гродненской тюрьме одного осужденного.

!2 миллионов рублей - таково месячное содержание одного осужденного. При этом на питание затрачивается 3,8 миллиона рублей. Дневной рацион невольника, не привлекаемого к работам, выглядит так (в граммах): хлеб ржаной - 550, мука пшеничная - 10, крупы разные - 90, макаронные изделия - 10, мясо - 40, рыба - 70, жиры животные - 15, масло растительное - 15, сахар - 20, картофель - 600, овощи - 300, лавровый лист - 0,1, томатная паста - 3 грамма. Курящему выдается 6 сигарет низкого качества в сутки. Информация достоверная, она получена с ведома начальника тюрьмы.

Люди трудятся, даже если их жизнь протекает за высокой тюремной стеной. Правда, есть проблемы, связанные с обеспечением их работой. Так, в гродненской тюрьме занятость трудом осужденных составила с начала года 27,8 процента, а в июле - 29,8 процента. Средняя заработная плата при хозяйственном обслуживании учреждения - 4,4 миллиона рублей в месяц. Осужденный, работавший сдельно, получал в среднем 5,5 миллиона рублей. Эти деньги при желании можно потратить на те же продукты питания, которые предлагает тюремный буфет.

В. СТАРОБЕЛЬСКИЙ

МАСТЫ

Пад надзейнаю аховай

Катэджы мастоўскай наменклатуры, якія яна будуе ўжо другі год, надзейна ахоўваюцца.

Напрыклад катэдж генеральнага дырэктара АТ "Мастоўдрэў" ахоўваюць чатыры вартаўнікі з ліку рабочых, якія атрымліваюць заробак на асноўным месцы працы. А вось будучыя апартаменты старшыні райвыканкама Аляксандра Кісялёва, яго намесніка Адама Кавалька ды былога начальніка міліцыі Мечыслава Улана пільнуе толькі адзін чалавек.

Няма нічога святога

Айцец Мастоўскай царквы Усіх смуткуючых Радасці пад час нядзельнай службы паведаміў сваім прыхажанам, што ноччу невядомыя асобы скралі ў яго 18 індыкаў.

"ГС"

"РАЦЫЯНАЛЬНЫ ДОМ" ПАД ДАХАМ ПРЭЗІДЭНТА

Хутка ў Гродне пачнуць будаваць шматпавярховы жылы дом у мікраёне "Вішнявец-2". У доме - 142 кватэры, а здаць яго "пад ключ" плануюць праз 10 месяцаў. Адкуль такія тэмпы? Гэтая будова - першы крок у рэалізацыі дзяржаўнай праграмы жыллёвага будаўніцтва "Рацыянальны дом" у нашым горадзе. А створана праграма загадам прэзідэнта яшчэ два гады таму. Яе арганізатарамі назначылі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі, Мінскі гарвыканкам і АСБ "Беларусбанк". Адказны выканаўца праграмы - Інвестыцыйна-будаўнічая асацыяцыя "Рацыянальны дом".

Паколькі праграма - дзяржаўная, то кіраўнікі асацыяцыі не могуць самі вырашаць, у якім раёне будаваць дом. Пляцоўкі вызначае гарвыканкам. Таму новы дом з'явіцца ў такім няхайгрышным раёне. Увогуле з будаўнічымі пляцоўкамі - вялікія цяжкасці. У такіх абставінах кіраўнікі "Рацыянальнага дома" выразшылі ў будучым ісці нетрадыцыйным шляхам. Гэта значыць, што ў новазбудаваны дом будуць засяляць жыхароў прыватнага сектару, а старыя дамы знясуць. А на іх месцы пабудуюць новыя шматпавярховікі. Такім чынам будуць вызваляцца новыя пляцоўкі.

Жыллё ў новых дамах размяркоўваць не будуць. Каб атрымаць тут новую кватэру, трэба стаць удзельнікам праграмы "Рацыянальны дом" - гэта значыць інвестарам. Тут трэба прайсці два этапы. На першым назапасіць 50% кошту новай кватэры. Пасля можна ўсяліцца і атрымаць крэдыт, каб заплаціць астатнія 50%. За першую палову кватэры грошы можна ўносіць нерэгулярна і невялікімі сумамі. Крэдыт мусіш выплочваць без затрымак, бо з кватэры могуць проста выселіць, калі не атрымаюць платы на працягу 6 месяцаў. Да таго ж, за новую кватэру можна часткова разлічыцца старой і працягваць там жыць аж да навасельля. Расплочвацца трэба нацыянальнай валютай - беларускімі рублямі. У "Рацыянальным доме" вельмі хітра прыдумалі, як абараніцца ад інфляцыі. Кожны раз ты будзеш не проста плаціць грошы, а выкупляць пэўную колькасць квадратных метраў новай кватэры. Гэта значыць, што кожны месяц кошты на метр можна падымаць.

Цікава, што сама ідэя такой праграмы з'явілася на Захадзе. У Германіі яшчэ ў 1922 годзе стварылі першую будаўнічую зберагальную касу. Цяпер гэтая сістэма ахапіла ўсю Еўропу, а ў Амерыцы яна, чамусьці, не прыжылася.

Кіраўнікі асацыяцыі кажуць, што праграма разлічана на сем'і з сярэднім дастаткам. "Выручыць 18-19 мільёнаў з сямейнага бюджэту пры сярэднім заробку больш чым дваццаць мільёнаў - гэта нармальна", - лічаць яны. Хоць у нас далёка не кожны атрымлівае такія грошы.

Напэўна, больш за ўсё кіраўнікі "Рацыянальнага дома" любяць расказваць пра самі кватэры. Тут ёсць чым пахваліцца. Усе кватэры плануюцца па жаданню пакупніка. "Калі вы хочаце мець дзве спачывальні па 12 квадратных метраў, кухню 18 і залу 25 метраў - няма праблемаў", - кажуць у асацыяцыі. Можна зрабіць зімовы сад, а замест прыхожай- цэлы хол. Галоўнае - каб былі грошы. Па заказу тут зробяць кватэру з двух узроўняў: на прэшым - напрыклад, крама, а на другім могуць жыць гаспадары. Да таго ж, усе матэрыялы - айчынныя.

Усе дамы будуць шматпавярховыя. "Мы, канечне, разумеем, што гэта разумна - жыць у нізкім доме. Але малапавярховыя дамы - гэта не для нашай кішэні. Тут трэба працягваць сеткі, камунікацыю, новыя дарогі пракладваць. Менталітэт у нас не той, ды і не такія мы багатыя".

Трэба дадаць, што раней у нашым горадзе не будавалі высокія дамы з-за таго, што ў пажарнікаў не было лесвіц, якія даставалі б вышэй за 9-ты паверх. Таму, калі б дваццаціпавярховы будынак загарэўся, пажарнікі нічым не змаглі б дапамагчы. Цяпер "Рацыянальны дом" набудзе спецыяльнае абсталяванне для пажарнікаў нашага горада, каб можна было пабудаваць высокія дамы.

Дарэчы, асацыяцыю "сур'ёзна спраўджаў КДБ. Але такіх парушэнняў, за якія трэба было б адсекчы галаву, не знайшлі". Таму офіс "Рацыянальнага дома" знаходзіцца не абы дзе, а ў адным з карпусоў Дома ўрада на вуліцы Мяснікова.

Т.БАЗЫЛЕВІЧ

ВЕРАСЕНЬ 1939-га: ВЫЗВАЛЕННЕ ЦІ ЗАНЯВОЛЕННЕ?

Працяг. Пачатак у нумары 35(80) ад 2.09.99.

Страчаная спадчына

Частка II.

Як з нас рабілі "савецкіх людзей"

Як беларусы сустракалі Чырвоную армію? Бяднейшая частка вітала з энтузіазмам. У некаторых вёсках нават будаваліся трыўмфальныя брамы. У асобных мясцовасцях наступаючым войскам аказвалася ваенная падтрымка. Так, у Скідалі адбылося ўзброенае паўстанне супраць польскіх уладаў, у мястэчку Лунна быў захоплены мост праз Нёман, які ўтрымлівалі да падыходу Чырвонай арміі. Ініцыятарамі гэтай актыўнасці звычайна былі члены Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Галоўнай прычынай выразных прабальшавіцкіх настрояў часткі беларусаў была палітыка польскіх уладаў. Вельмі вострай была зямельная праблема. Беларуская вёска задыхалася ад недахопу зямлі, якая зачастую перадавалася асаднікам з ліку былых салдат Войска польскага. Працягваўся ўціск беларускай культуры. У 1938-39 навучальным годзе на ўсю Заходнюю Беларусь засталося толькі 5 сярэдніх беларускіх школ і 1 беларуская гімназія.



1939 год. Заходняя Беларусь сустракае Савецкую ўладу.

За некалькі дзён да нападу Германіі на Польшчу ў Вільні распачаліся арышты беларускіх дзеячоў. У турму быў кінуты нават дэпутат Сейма Янка Станкевіч, там жа апынуўся дырэктар беларускай гімназіі Міхась Анцукевіч, рэдактар газеты "Шлях моладзі" Язэп Найдзюк і інш. Адбыліся арышты ў Гародні, Наваградку, Баранавічах, Ашмянах.

Да таго ж , частка беларусаў паверыла камуністычнай прапагандзе, якая ўслаўляла савецкі лад у БССР. Пра сапраўдны твар савецкага сталінізма яны нават не здагадваліся. У 1939 г. гэтым людзям здалося, што прыйшла "свая" ўлада. У многіх "радасць" вітання была выклікана звычайнай бояззю чужога войска.

Гэтую "беларускую радасць" савецкая прапаганда і гістарыяграфія раздулі да неверагодных памераў. У кнізе "Гродно. Историко-экономический очерк", выдадзенай у Мінску ў 1988 г.(!) (пад рэд. гродзенскіх гісторыкаў-прапагандыстаў І.Крэня і М.Жарскага), напрыклад, сцвярджалася: "Весть об освободительном походе Красной Армии быстро облетела западнобелорусские и западноукраинские земли и с восторгом была встречена их населением. Во многих местах ещё до прихода советских войск рабочие и крестьяне разоружали полицию, осадников, брали власть в свои руки" (с.107-108) і г.д.

Сёння відавочна, што тэзіс пра адзінства беларусаў у падтрымцы Чырвонай арміі - гэта міф, які не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю верасня 1939 г. Большасць беларусаў заняла чакальную пазіцыю (здаецца, гэта тыповая "беларуская пазіцыя"). Людзі назіралі і чакалі, што будзе далей. Шоку ў адрозненні ад палякаў беларусы не перажывалі. II Рэч Паспалітая так і не стала для іх Радзімай.

Аднак за перыяд 1939-41 гг. у свядомасці многіх палякаў замацаваўся вобраз беларуса-бальшавіка - ворага польскай дзяржавы. Справа ў тым, што разам з "вызваленнем" пачаліся масавыя арышты, вобыскі, рэквізіцыі. Ад імя народу рабаваліся маёнткі і сядзібы асаднікаў, здзекваліся над гаспадарамі, якіх у лепшым выпадку проста выкідалі на вуліцу. Нярэдкай з'явай былі забойствы. Так, былі забітыя амаль усе мужчыны з роду Скірмунтаў. У рабаваннях і забойствах актыўна ўдзельнічала беларуская і яўрэйская бедната.

Але гістарычныя факты ўсё ж такі сведчаць, што ў антыпольскіх выступленнях прымала ўдзел меншасць беларускага насельніцтва. Большасць пасіўна назірала. Частка беларусаў, рызыкуючы ўласным жыццём, дапамагала праследуемым.

Адразу пасля "вызвалення" распачалося ўстанаўленне таталітарнага камуністычнага рэжыму, або так званая "саветызацыя" Заходняй Беларусі. У адносінах да беларусаў выкарыстоўвалася палітыка "бізуна і перніка". Бальшавікі на ўвесь свет крычалі пра "гістарычнае ўз'яднанне беларускага народа ў адной дзяржаве", запрашалі беларускіх дзеячоў да супрацоўніцтва. Але адначасова распачаўся антыбеларускі тэрор і "перавыхаванне" ў камуністычным духу.

З прыходам Чырвонай арміі былі зліквідаваны мясцовыя органы ўлады і самакіравання, забаронены партыі і грамадскія арганізацыі. Аснову кіруючых кадраў складалі так званыя "ўсходнікі". Да 1 кастрычніка 1940 г. у Беластоцкую вобласць для кіравання прыехала каля 12 400 начальнікаў ("спецыялістаў"). Гэта былі камуністы і камсамольцы, супрацоўнікі НКВД, афіцэры міліцыі і войска разам з сем'ямі. Толькі з восені 1940 г. пачалі прызначаць на кіруючыя пасады мясцовых ураджэнцаў. Фактычна, новыя органы ўлады, партыйныя і камсамольскія арганізацыі не мелі масавай апоры сярод насельніцтва і дзейнічалі выключна адміністратыўнымі метадамі, абапіраючыся на карныя органы і войска.

Усё рабілася па раней распрацаванаму сцэнарыю. "Выбары" ў Народны сход, якія павінны былі пацвердзіць жаданне людзей далучыцца да СССР, сталі сапраўдным спектаклем. Кандыдатаў у дэпутаты вызначалі толькі партыйныя ўлады. Пры чым, як у лепшых савецкіх традыцыях у выбарчым бюлетэню быў толькі адзін кандыдат. (Вось такі выбар!) Ніхто з выбаршчыкаў не ведаў, якія пытанні будзе вырашаць Сход. Пазней выбары і рашэнні Народнага сходу гісторыкі пачалі называць "плебісцытам", што ў святле гістарычных фактаў было проста хлуснёй.

28 кастрычніка 1939 г. у Беластоку сабраўся Народны сход. На ім дамінавалі партыйныя функцыянеры з Усходу. У выніку былі прыняты дэкларацыі пра ўваходжанне ў СССР, стварэнне органаў савецкай улады, нацыяналізацыю зямлі, банкаў, прамысловасці і транспарту.

Рэальны ўплыў мясцовых беларусаў на гэтыя рашэнні быў блізкі да абсалютнага нуля. Але ўсё было пададзена якраз як воля беларусаў. Хаця на гэтым сходзе за ўваходжанне ў СССР былі вымушаныя галасаваць і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, у тым ліку і 127 палякаў.

Саветызацыя адбывалася сістэматычна і па плану ва ўсіх галінах жыцця. Галоўнымі мэтамі пераўтварэнняў у сацыяльна-эканамічнай галіне была нацыяналізацыя зямлі і ўсёй эканомікі, індустрыялізацыя і калектывізацыя. Зямельная рэформа ліквідавала не толькі памешчыцкае і касцёльнае землеўладанні, але і буйныя сялянскія гаспадаркі ("кулацкія"). Спачатку іх памеры абмежавалі 10-15га. Потым у 4-5 разоў павялічылі падаткі і натуральныя зборы. У выніку пачаўся ўпадак гэтых гаспадарак. Затое бяднейшыя сяляне атрымалі зямельныя надзелы.

Уводзілася савецкая сістэма вытворчасці, якая грунтавалася на прымусовай працы і нізкім узроўні аплаты. Прамысловасць падпарадкоўвалася бюракратычнаму апарату. Уводзілася жорсткая дысцыпліна працы. Спазненне, невыхад на працу караліся лагерным зняволеннем.

У фінансавай галіне злоты зраўнялі з рублём, а ў снежні 1939 г. проста зліквідавалі. Гэта прывяло да рэзкага зніжэння жыццёвага ўзроўня і высокай ступені залежнасці ад уладаў, бо людзі не мелі рублёў.

Значныя перамены адбываліся ў галіне адукацыі. Пачаўся працэс русіфікацыі і беларусізацыі школ. Польская мова ў школах забаранялася. З'явілася шмат беларускіх школ, хаця многія прывілеі беларусы атрымалі толькі фармальна. Мясцовыя настаўнікі часткова звальняліся, часткова накіроўваліся на курсы "палітычнага перавыхавання". У ліпені 1940 г. у Беластоку на спецыяльных курсах па вывучэнню гісторыі ВКП(б) займалася каля 4 тыс. настаўнікаў. Значная частка навучальнай праграмы адводзілася крытыцы "контррэвалюцыйных" партый і атэістычнаму выхаванню.

У прававой сістэме на змену часовым вайсковым судам прыйшлі грамадзянскія "народныя" суды. Аднак прававая сітуацыя прынцыпова не змянілася. Суды папранейшаму кантраляваліся партыйнымі органамі. Прававая сістэма насіла рэпрэсіўны характар. Усё, што служыла "справе сацыялізма", а гэта значыць, што адпавядала інтарэсам камуністычных чыноўнікаў, было згодным з правам. Таму і шматлікія рэпрэсіі зусім не пярэчылі заканадаўству.

Камуністычныя ўлады ўмела распальвалі канфлікты паміж рознымі народамі. У часовым фавары была яўрэйская бедната і беларусы. Уладам трэба было каго-небудзь супрацьпаставіць палякам. Аднак нацыянальна-культурныя імкненні нават у фаварытаў падаўляліся. Затое для ўсіх быў адкрыты доступ да савецкай адукацыйнай сістэмы.

Польскасць прыціскалася ва ўсіх галінах жыцця. Палякаў называлі "каланізатарамі". Распачаліся рэпрэсіі супраць дзеячоў польскай культуры, адміністратыўных чыноў і, наогул, супраць усіх, хто так ці інакш меў дачыненне да дзяржаўных структураў. Толькі ўлетку 1940 г. пасля разгрома гітлераўскай Германіяй Францыі пачалі адбывацца пэўныя перамены ў адносінах да польскай грамадскасці. Улады, быццам, пачалі шукаць яе падтрымкі. Нават распаўсюджваліся чуткі пра магчымае стварэнне польскай аўтаномнай вобласці.

Усё гэта савецкія гісторыкі акрэслілі "сацыялістычнай рэвалюцыяй". Пры гэтым яны абапіраліся выключна на прапагандысцкую версію падзей.

Разам з уступленнем Чырвонай арміі распачаліся рэпрэсіі супраць мясцовага насельніцтва. Адной з першых ахвяраў "вызваліцеляў" сталі беларускія дзеячы Віленшчыны.

Рашэнне пра перадачу Вільні Літве было прынята ў канцы верасня. Да гэтага часу хадзілі чуткі, што Вільня застанецца ў складзе Заходняй Беларусі і менавіта тут будзе сталіца БССР. Пасля прыняцця рашэння пра перадачу Вільні ўлады адразу распачалі рэпрэсіі супраць віленскай беларускай інтэлігенцыі. Яны спяшаліся, каб паспець да прыходу літоўскіх уладаў. На астатняй тэрыторыі такой спешкі не назіралася.

Першыя арышты адбыліся ў ноч на 27 верасня. Адной з першых ахвяраў стаў славуты Антон Луцкевіч. Ягонае "знікненне" паспрабавалі захаваць у таямніцы, але не атрымалася. Прыйшлося афіцыйна заявіць, што Луцкевіч выехаў на працу ў Менск. Былі арыштаваныя Антон Трэпка, Вячаслаў Багдановіч, Уладзімір Самойла, Янка Пазьняк, Макар Касцевіч і інш.

Гэта быў страшны ўдар па Беларусі. Знішчаўся адзіны незалежны цэнтр інтэлектуальнага і культурнага жыцця беларусаў, які яшчэ заставаўся. Ягоная ліквідацыя азначала крах беларускіх надзей на незалежную Беларусь. У выніку рэпрэсій і арыштаў на доўгія гады быў затрыманы працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці і пачатак новага этапа беларускага Адраджэння. Беларусаў вызвалілі не толькі ад "панскага прыгнёту", але і ад уласнай інтэлігенцыі, ад уласнай нацыянальнай эліты.

Усё грамадства было ахоплена сістэмай рэпрэсій і запалохвання. Людзей дзялілі на тых, каму можна давяраць і каму нельга. Вялікую ролю ў гэтым падзеле адыгрывалі рознага роду анкеты. Звярталася ўвага на сацыяльнае паходжанне, працу, сваякоў і сяброў, на матэрыяльнае становішча. Шырока выкарыстоўваліся правакацыі. Падчас выбараў у Народны сход пыталіся, хто супраць прапанаванай кандыдатуры? Падчас рэгістрацыі бежанцаў ставіліся пытанні, хто хоча вярнуцца ў Генерал-губернатарства, якое было было ўтворана гітлераўцамі на захопленых польскіх тэрыторыях, і г.д.

Нормай жыцця сталі арышты і дэпартацыі. Для арышту дастаткова было ананімовага даносу. Лёс чалавека цалкам залежаў ад супрацоўніка НКВД. Турмы былі перапоўнены. У Беластоцкай турме замест 1,5 тыс. чалавек знаходзілася 8 тыс. Шмат арыштаваных было вывезена на ўсход. Адчыняліся новыя турмы: у Аўгустове - у будынку яхт-клуба, у Шчучыне - у кляштары піяраў. Умовы ўтрымання былі жудаснымі. Наогул, у 1939-41 гг. у турмах Заходняй Беларусі знаходзілася ў 4 разы больш зняволеных, чым ў часы вайны 1941-44 гг.

Па звестках беларускага гісторыка А.Хацкевіча рэпрэсіі пачаліся адразу са з'яўленнем "вызваліцеляў". Арыштоўвалася прыблізна па 800 чалавек у тыдзень. Судзіла іх вядомая сталінская "тройка". Толькі за красавік-май 1940 г. было растраляна каля 22 тыс. чалавек, сярод якіх былі і польскія афіцэры-рэзэрвісты. Як паказала расследаванне беларускага журналіста Яўгена Гарэліка, каля 3 тыс. з іх было растраляна ў Курапатах.

З пачатку 1940 г распачаліся масавыя дэпартацыі. За гэтым тэрмінам хавалася звычайнае забойства, бо амаль немагчыма было (асабліва старым і дзецям) вытрымаць умовы пераезду і выжыць дзе-небудзь у пустынным казахскім стэпу. Тэхналогія дэпартацый была распрацавана значна раней і ўжо прайшла "абкатку", у прыватнасці, у БССР.

Першая дэпартацыя адбылася 10 лютага 1940 г. Планавалася "высяліць" 51 300 чалавек. На зборы даваліся 2 гадзіны. Па дакументах НКВД на 24.00. гэтага дня было "выселена" 44 тыс. чал., з якіх 29 тыс. былі ўжо "загружаны" ў эшалоны. Цалкам план быў выкананы 13 лютага. Недабор кампенсавалі дэпартацыяй людзей, якіх планавалася высяляць у наступны раз. Умовы дэпартацыі былі жахлівымі. Смяротнасць сярод дзяцей дасягала 50%. Па этнічнаму складу сярод дэпартаваных пераважалі палякі. Цікава, што дакументы НКВД амаль не зафіксавалі спробаў актыўнага супраціўлення. Хаця частка людзей усё ж здолела схавацца. Тое, што адбывалася было поўнай нечаканасцю. Амаль ніхто не мог уявіць сабе нешта падобнае.

